Народная Газета

Жыві, Беларусь!

Орган Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

№ 184 (197) 20 верасня 1991 г. Пятніца.

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1990 ГОДА НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ.

Кошт: у розніцу — 10 кап. падпісны — 3 кап.

Факты Аргументы Комментарии Суждения

Забастовка как самый надежный инструмент

ГОРКИ. ПМК-1 объединения «Горкисельстрой» наметил на 23 сентября однодневную предупредительную забастовку. Чем же это вызвано!

Требования рабочих: провести аттестацию ИТР и сократить лишний управленческий аппарат, обеспечить рабочих инструментами и техникой, улучшить бытовые условия. Если это не будет выполнено, ПМК, похоже, действительно остановится.

Есть национальный флаг!

Оказывается, восстановить национальную символику можно и без решения парламента. Вот как это сделал народный депутат Белоруссии В. Коваленок.

Во время дневного перерыва вчера он вышел на площадь Ленина к пикетчикам, взял бело-красно-белый флаг и в окружении своих верных единомышленников двинулся к зданию парламента. Милиция, правда, его попутчиков остановила, и поэтому известный космонавт, дважды Герой Советского Союза дальше действовал, как говорится, по своему усмотрению. И, несмотря ни на что, все-таки установил национальный флаг рядом с флагом бывшей БССР. Правда, пока только в зале заседаний Верховного Совета. Но, главное, пример был показан...

Когда верстался номер, нам стало известно, что на вечернем заседании парламент утвердил государственным флагом Белоруссии — бело-красно-белый.

Что сказал бы дедушка Ленин?

ОРША. В районном комбинате бытового обслуживания на редкость быстро заменили директора М. Е. Цотова. Спешка с увольнением совпала с трудоустройством бывшего партийного работника.

Теперь руководителем райКБО стала недавний секретарь райкома партии Нина Видяева. Управляющий облуправлением бытового обслуживания Галыкин представил ее трудовому коллективу. Это продолжение стиля деятельности райкома партии — такой вывод сделали на комбинате.

Как нам стало известно, бывшие же горкомовцы «не рвутся» пока на доходные места столь грубо, хотя и «устраиваются», минуя центр по трудоустройству. Замечено, они в основном нашли себе применение в тех должностях, в которых пребывали до партийной работы.

Правда, есть исключения. Бывший секретарь горкома Дмитрий Шабанов открыл свое предприятие «Содружество», где будет выпускать товары народного потребления.

Гимназистки выйдут из обкома?

ВИТЕБСК. Наиболее подходящее помещение для гимназии то, которое занимал обком КПБ, утверждает группа граждан, обратившаяся в облсовет от имени общественности города.

Старинное здание на площади Свободы, действительно, могло бы соответствовать духу учебного заведения, которое, по мнению «челобитчиков», должно приблизиться к дореволюционному типу. Здесь предполагается изучать закон Божий, а также танцы и музыку.

В кабине горели дети

В Логойскую районную больницу доставлены двое детей со страшными ожогами.

Трагедия произошла на днях в деревне Калачи. Ребята, старшему из которых едва исполнилось 5 лет, забрались в трактор и принялись играть со спичками. Кабина вспыхнула буквально за несколько секунд.

«Чему нас учит семья и школа?»

МСТИСЛАВЛЬ. Странное занятие нашли для себя четверо учащихся местного СПТУ — поджигали ларьки на базаре, танцплощадку, магазин «Кулинария».

За свои «художества» они получили на суде от полутора до трех лет. Правда, исполнение наказания отсрочено до наступления их совершеннолетия...

Вкратце

◆ Государственный Совет СССР официально назначил И. Силаева главой межреспубликанского экономического комитета, то есть, по сути, премьер-министром страны. До этого Иван Силаев сказал, что он уходит с поста председателя Совета Министров России.

◆ Советский министр иностранных дел Панкин, выступая в столице Швеции, заявил, что Москва намерена сократить до минимума число агентов КГБ за рубежом.

◆ Программы Грузинского телевидения прерываются из-за забастовки журналистов, протестующих против попыток правительства взять под контроль средства массовой информации.

◆ Председатели Верховных Советов Прибалтийских государств заявили, что они отвергают требования Советского Союза о выплате компенсаций.

◆ Лидеры Европейского сообщества расходятся во мнениях по поводу предложения Нидерландов направить в Югославию силы по поддержанию мира.

◆ Кабульское правительство восстановило в гражданстве бывшего короля Афганистана.

Кофе будет. Но очень дорого

РИО-де-ЖАНЕЙРО. Бразилия и Колумбия договорились уменьшить на 10 процентов экспорт кофе, с тем чтобы вызвать повышение цен на этот продукт на мировом рынке. Кстати, обе эти страны являются производителями почти 50 процентов всего мирового кофе.

«Биатлон»: соревнуются «леди»

ИЖЕВСК. **Превращение «самой закрытой зоны СССР» — Удмуртии в регион, открытый для западного бизнеса, вдохнуло свежие силы и в местных представительниц древнейшего ремесла.**

Вечерами в районе гостиницы «Биатлон», где живут иностранные специалисты, стали собираться «леди», готовые к определенного рода услугам за символическую по нынешним временам плату — 20 рублей в час. Столь низкая цена объясняется тем, что предложение пока опережает спрос.

Долг платежом красен

БУДАПЕШТ. **Министерство финансов Венгрии подготовило анализ состояния советско-венгерской торговли. Перспективы пока что безрадостные.**

По всей видимости, как указывается в документе, объем венгерского экспорта в СССР в 1991 году снизится в значительно больших размерах, чем прогнозировалось ранее. Причина — продолжающееся сокращение платежеспособности советского партнера.

Допрос Горбачева. С адвокатами

МОСКВА. **Защитники членов ГКЧП потребовали провести допрос Президента СССР с их участием.**

Они надеются, что в нынешних условиях демократии объективное расследование возможно. По их мнению, следственный процесс необъективен. Они считают, что в действиях их подзащитных нет состава преступления, предусмотренного 64-й статьей УК СССР.

Мост в сладкое будущее закрыт

В Оренбурге начались беспорядки, вызванные снабжением города сахаром.

Поводом для этого послужили многочисленные нарушения правил торговли, отпуск сахара с черного хода и припрятывание этого товара. На днях толпа перекрыла дороги в одном из крупных районов города — Дзержинском. А вчера протестующие заблокировали мост, связывающий части города. Многочисленные попытки работников горисполкома, представителей облсовета снять напряженность пока к успеху не привели.



Рисунок Олега ПОПОВА.

Ни пяди не уступим!

ЮЖНО-САХАЛИНСК. **Вслед за президиумом Южно-Курильского районного Совета народных депутатов отреагировал на «проблему северных территорий» и малый совет Курильского районного Совета народных депутатов.**

В своем обращении к руководителям России и правительству Японии резко осуждаются действия политиков, решающих судьбы людей без учета их мнения. Депутаты не исключают возможности провозглашения полного суверенитета Курильских островов.

«Мы Родиной не торгуем, — подчеркивается в обращении. — И не советуем делать это другим...»

«Сорокапроцентное» здоровье

На Магнитогорском калибровочном заводе введена 40-процентная экологическая надбавка для всех работников.

Основанием послужило принятие августовским съездом народных депутатов СССР Декларации прав и свобод человека. В ней как раз и говорится о возмещении ущерба, причиненного здоровью из-за экологических нарушений, и правах на проживание в «чистых» городах, поселках деревнях...

Выпуск подготовлен по сообщениям Виктора ЛЕЩЕНКО, Ольги ШУТОВОЙ, Сергея БУТКЕВИЧА, Владислава ПЛАТУНА, Анатолия ГОТОВЧИЦА и агентств «Инфо-нова» и «Урал-акцепт». «Горячий» телефон работает ежедневно с 9 до 11 часов.

ЖЫВІ І КВІТНЕЙ, БЕЛАРУСЬ!

19 верасня 1991 года на карце свету з'явілася новая суверэнная дзяржава

Канферэнц-зала

Шушкевіч і не яго каманда

Два дні работы беларускага парламента, што трымалі ў напружанні рэспубліку, у рэшце рэшт скончыліся. І хочацца верыць, што Бог усё-такі зняў свой праклён з нашага і без таго пакрыўджанага ім народа і дараваў Беларусі добрага, разумнага і разважлівага лідэра.

Такім чынам, куды і за кім мы пойдзем далей, ці маем мы, беларусы, шанц «людзьмі звацца»?

Менавіта на гэтыя надзённыя пытанні і хацелі пачуць адказ журналісты з вуснаў Станіслава ШУШКЕВІЧА ў час яго першай прэс-канферэнцыі ў якасці Старшыні беларускага парламента.

Найперш пра будучых паплечнікаў Станіслава Станіслававіча:

Старшыня Савета Міністраў рэспублікі Вячаслаў Кебіч, былы прэтэндэнт на пасаду кіраўніка парламента Беларусі.

— Я быў да гэтага часу ўпэўнены і застаюся цяпер перакананы, што Вячаслаў Францавіч—гэта той чалавек, які па праву ўзначальвае беларускі ўрад і ён здольны будзе зрабіць тое, чаго не зрабіў рачэй. У яго было значна больш складанасцей, чым у мяне, бо я не звязаны ні з якімі партыйнымі згуртаваннямі.

Напярэдадні шостай сесіі мы былі разам з ім у Маскве, але ён не гаварыў мне, што будзе вылучацца на пасаду Старшыні ВС БССР. Па праўдзе кажучы, я меркаваў, што ён будзе паводзіць сябе інакш. Тым не менш я лічу яго вельмі станоўчым чалавекам.

Першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета БССР.

— Я ўпэўнены, што змагу працаваць з чалавекам любых перакананняў, паколькі работа першага намесніка мне самому добра вядомая. Трэба толькі, каб чалавек быў здаровы і разумны. З якой фракцыі? Хацеў бы, каб ён быў станоўча ўспрыняты Вярхоўным Саветам. Думаю параіцца з рознымі палітычнымі групоўкамі ў парламенце рэспублікі і знайсці аптымальную фігуру. У маім рэестры прапаноў 7 прозвішчаў кандыдатаў на пасаду віцэ-Старшыні. Мне вельмі хацелася ўключыць у гэты спіс жанчыну, але не ўдалося.

Дарэчы, у мяне няма сваёй каманды, я прыйшоў сюды адзін. І, наогул, у мае гады сяброў не заводзяць. Я не маю намеру тут сябраваць, трэба працаваць!

ВЯРХОЎНЫ САВЕТ БССР

— Якая парламенцкая фракцыя мне сімпатызуе, дакладна сказаць не магу. Я даволі даўно не хаджу на пасяджэнні існуючых у ВС БССР груповак. Баюся нават, што не ведаю пра ўсе парламенцкія фракцыі. Адно магу сказаць, што з паловай народных дэпутатаў БССР я знаходжу паразуменне. Па выніках першага галасавання пры выбранні Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі відавочна, што са мной знаходзяць паразуменне дзесці 120 парламентарыяў. Але паколькі галасаванне было тайным, мне цяжка вызначыць, з якой яны палітычнай групоўкі.

Што датычыць пытання аб роспуску цяперашняга Вярхоўнага Савета, то гаварыць пра гэта цяпер недапушчальна. Пакуль у нас няма новай Канстытуцыі рэспублікі, няма закона аб выбарах, пястуйце гэты парламент і ратуйце яго.

Акрамя таго, цяперашні Вярхоўны Савет БССР эвалюцыянізіруе. Па выніках работы ён пайшоў значна далей, чым можна было ад яго чакаць. Так, змяніліся абставіны. Тады давайце ствараць людскія абставіны, каб гэты Вярхоўны Савет прыняў рашэнне ў інтарэсах нашага народа.

Думаецца, што і сам Станіслаў Станіслававіч з свайго боку створыць такія людскія абставіны ў Вярхоўным Савеце БССР, каб ён і сапраўды працаваў толькі на карысць беларускага народа, а не пэўных палітычных плыняў ці аджыўшых прынцыпаў.

Мікола ДЗЯБЕЛА.

Погляд з балкона

«Выберыце яго—ён хлопец добры!»

На вырашэнне першага пытання ў парадку дня сесіі парламент затраціў амаль два дні. Але, думаю, гэты час патрачаны недарэмна. Бо цяпер рэспубліка на любых перамовах будзе прадстаўлена законна абраным лідэрам. Бо цяпер ён можа пачаць выконваць сваю праграму, а не заставацца ў падвешаным стане.

Людзі Рэспублікі Беларусь! З учарашняга дня менавіта так называецца наша з вамі Радзіма. З учарашняга дня над намі ўсімі лунае спрадвечны бел-чырвона-белы беларускі сцяг, а наша «Пагоня», парваўшы ланцугі таталітарызму, зноў, як і стагоддзі назад, імчыць у пагоню за шчасцем і воляй народа.

Безумоўна, такім жа важным было і пытанне «Аб дэлегаванні ў састаў зноў утвараемага Вярхоўнага Савета СССР прадстаўнікоў Беларускай ССР». Беларусь, як і любая іншая рэспубліка, мае права вылучыць з ліку народных дэпутатаў БССР і СССР дваццаць чалавек у Савет Рэспублік і дзесяць — у Савет Саюза Вярхоўнага Савета СССР.

Папярэдняя работа па вылучэнню кандыдатур ужо была праведзена. Не вырашаным засталося пытанне аб прапорцыі дэпутатаў БССР і СССР. Аб гэтым і сказаў у сваім невялікім дакладзе старшыня Камісіі па нацыянальных пытаннях і міжнацыянальных зносінах Міхаіл Слямнёў. Паступіла некалькі прапаноў: дзесяць дэпутатаў БССР і дзесяць — СССР; пятнаццаць БССР і пяць СССР; наогул галасаваць за кожнага індывідуальна, і хто набярэ больш галасоў — той і праходзіць. Няважна — гэта народны дэпутат БССР ці СССР.

У рэшце рэшт апошняя прапанова і прымаецца. Праўда, перад гэтым дэпутаты папрасілі праінфармаваць іх, чым канкрэтна будзе займацца Савет Рэспублікі? Савецкі ж Саюз развальваецца, некаторыя рэспублікі ўжо сталі незалежнымі дзяржавамі, іншыя да гэтага імкнуцца. Таму прынцыпова важна ведаць, якія ў дадзеных умовах будуць паўнамоцтвы ў дэпутатаў, абраных у Савет Рэспублік.

Міхаіл Слямнёў адказаў на пытанні, паведаміў, што чакае дэпутатаў у матэрыяльным плане, калі яны стануць членамі Савета Рэспублік Вярхоўнага Савета СССР.

Ад імя народных дэпутатаў СССР кандыдатуры сваіх калег, прапануемыя ў склад Савета Рэспублік, унёс народны дэпутат СССР Аляксандр Дабравольскі, называюцца прозвішчы і кандыдатаў у Савет Рэспублік з ліку народных дэпутатаў БССР.

Але ў гэты момант адзін за адным падыходзяць народныя дэпутаты Кавалёнак, Пісарэвіч, Лябедзька, Сарокін і, называючы розныя прычыны, просяць самаадвод. У зале ўзнікае нават нейкае хваляванне — так можа і наогул выбараў не адбыцца! Тым больш, калі перад гэтым яшчэ выступіў дэпутат Малашка і заявіў, што ў склаўшыхся ўмовах пасады членаў Савета Рэспублік будуць «хутчэй пачэсныя, чым дзеючыя».

Тым не менш у спісу застаецца дванаццаць народных дэпутатаў БССР, якія згодны працаваць у Маскве, вылучаюцца яшчэ некалькі. Аднак адразу ж узнікаюць спрэчкі наконт кандыдатур, цяпер ужо народных дэпутатаў СССР. Так, Васіль Шачак, Іван Герасюк выступілі супраць уключэння ў спіс Таразевіча, Сяргей Антончык — Зеляноўскага. Прымаецца рашэнне правесці асобнае галасаванне па кожнай кандыдатуры.

Парламент пачынае напамінаць аўтамабіль, які выехаў на роўную дарогу і... зноў спыніўся, спатыкнуўся на прозвішчы Лукашэнка: 161 голас за. Тут і я павінен прыпыніцца, каб падкрэсліць, што парламент яшчэ раз паказаў, як ён няпроста адносіцца да неардынарных людзей. Колькі потым было выступленняў, каб падтрымаць кандыдатуру Аляксандра Рыгоравіча як вопытнага спецыяліста, як прынцыповага чалавека, аднак бачна было, што частку дэпутатаў гэта не цікавіла.

Тут не магу не прывесці і прыклад з зацвярджэннем у склад Савета Саюза народнага дэпутата СССР Мікалая Бабрыцкага. Пасмеў ён сумленна адказаць на пытанне аб эканамічным стане рэспублікі, праявіў неасцярожнасць, пакрытыкаваўшы Савет Міністраў і Вярхоўны Савет БССР, — і не атрымаў неабходнай колькасці галасоў.

Аднак найбольшыя спрэчкі вызвалі кандыдатуры Анатоля Зеляноўскага ў склад Савета Рэспублік і Аляксандра Жураўлёва ў склад Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР. Уладзімір Грыбанаў прама заявіў, што калі будзе абраны Зеляноўскі, то ён адмаўляецца працаваць разам з чалавекам, які падпісаў сумнавядомую заяву ЦК КПБ. Народны дэпутат СССР Віктаровіч таксама выступіў з падобнай заявай, праўда, ён тады быў таксама кандыдатам (і, дарэчы, пасля гэтага не прайшоў). З пратэстамі выступілі іншыя дэпутаты, прыводзілі розныя факты, якія, на іх думку, даказвалі несумленнасць народнага дэпутата СССР Зеляноўскага. А ён стаяў за трыбунай і ніякія доказы, ніякія факты яго не кранаалі. Дэпутаты гаварылі пра маральнасць, этычнасць паводзін, а Зеляноўскі парыраваў, што «сам Віктаровіч несумленны чалавек», што яго справы «бачны на вытворчасці», што на ім няма «плямы і... сумлення». Безумоўна, у апошнім выпадку Зеляноўскі абмовіўся, але дэпутаты сустрэлі яго словы са смехам і задавальненнем. Гэта паказала і галасаванне. Толькі семдзесят два галасы ўдалося набраць Анатолю Антонавічу.

Не змог набраць неабходнай колькасці галасоў і Аляксандр Жураўлёў.

Такім чынам у Савет Рэспублік дэпутаты ад Беларусі вылучаны, у Савет Саюза застаюцца пакуль два вакантныя месцы. Безумоўна, праца іх чакае цяжкая. Таму добра, што не прайшлі кандыдаты, якія так ці інакш скампраметавалі сябе. Але балюча, што адсечаным аказалася і левае крыло, што не прайшоў Лукашэнка, што за бортам апынуліся кандыдаты ад апазіцыі, што перад галасаваннем за некаторых кандыдатаў гучала: «галасуйце за яго, ён добры гаспадарнік, добры чалавек...» Так, патрэбны нам добрыя людзі ў вярхоўным органе краіны, але яшчэ больш патрэбны сапраўдныя палітыкі. Гэтымі словамі не хачу пакрыўдзіць абраных дэпутатаў. Але, спадзяюся, парламент Беларусі пагодзіцца з думкай, што тое, дзе чалавек ваяваў, дзе працаваў, не з'яўляецца асноўным крытэрыем пры выбары яго ў найвышэйшы орган краіны.

Сяргей ПЛЫТКЕВІЧ,
агладальнік «Народнай газеты».

Сацыялагічны барометр

Дэпутаты хутчэй задаволены, чым не

Беларуская сацыялагічная служба «Грамадская думка» правяла апытанне народных дэпутатаў БССР. І хоць актыўнасць пры адказе на пытанні сацыёлагаў праявілі ўсяго 111 парламентарыяў з 346, мяркуем, пра вынікі даследавання чытачам «Народнай газеты» будзе ўсё ж цікава даведацца.

1. Ці задаволены Вы работай Вярхоўнага Савета рэспублікі, уключаючы ўвесь перыяд яго дзейнасці?

1. Задаволены поўнасцю — 7,2%.
2. Хутчэй задаволены, чым не — 34,2%.
3. Хутчэй не задаволены — 36,0%.
4. Незадаволены поўнасцю — 14,4%.
5. Пэўную ацэнку даць цяжка — 8,1%.

2. Як Вы ацэньваеце сваю ўласную дзейнасць у парламенце рэспублікі?

1. Ацэньваю як даволі эфектыўную — 12,6%.
2. Хутчэй як эфектыўную, чым не — 42,3%.
3. Хутчэй як неэфектыўную — 22,5%.
4. Ацэньваю як неэфектыўную — 6,3%.
5. Адназначную ацэнку даць не магу — 17,1%.

3. А як, на Вашу думку, ацэньваюць Вашу дзейнасць выбаршчыкі?

1. Ацэньваюць станоўча — 25,2%.
2. Хутчэй станоўча, чым адмоўна — 55,9%.
3. Хутчэй адмоўна, чым станоўча — 9,9%.
4. Ацэньваюць адмоўна — 0,9%.
5. Не ведаю — 8,1%.

4. Калі б выбары праводзіліся сёння, ці былі б Вы выбраны зноў?

1. Так — 9%.
2. Хутчэй так, чым не — 36%.
3. Хутчэй не, чым так — 14,4%.
4. Не — 3,6%.
5. Не ведаю — 36%.

5. У апошні час усё часцей гучаць патрабаванні аб роспуску Вярхоўнага Савета рэспублікі. Як Вы лічыце: ці вычарпаў свае магчымасці цяперашні склад парламента?

1. Так, вычарпаў — 26%.
2. Не, не вычарпаў — 68,4%.
3. Цяжка адказаць — 4,5%.

. . . .

8. Хто з членаў парламента рэспублікі з'яўляецца для Вас асабіста найбольш аўтарытэтным? (Назавіце не больш пяці прозвішчаў). Прозвішчы дадзены ў парадку частаты выбараў.

1. Шушкевіч.
2. Заблоцкі.
3. Пазьняк.
4. Булахаў.
5. Кебіч.
6—7. Карпенка, Ганчар.
8. Сасноў.
9. Садоўскі.
10. Гілевіч.
11—12. Лукашэнка, Кулакоў.
13—14. Скарынін, Кавалёнак.
15. Баршчэўскі.
16. Глушкевіч.

9. Як Вы ацэньваеце сучасную палітычную абстаноўку на Беларусі?

1. Палітычны працэс выйшаў з-пад кантролю, у рэспубліцы пануе анархія, яна некіруемая — 2,7%.

2. Рэспубліка знаходзіцца ў стане сур'ёзнага палітычнага крызісу: калі не прыняць рашучых мер, сітуацыя можа стаць некіруемай — 69,3%.

3. На Беларусі ідзе нармальны працэс дэмакратызацыі палітычнага жыцця: ёсць пэўныя пераборы, памылкі, але гэта з'яўляецца натуральным для пераходнага перыяду — 29,7%.

4. Цяжка адказаць — 0,0%.

10. Якія першачарговыя меры неабходна прыняць, на Вашу думку, каб вывесці рэспубліку з эканамічнага крызісу?

1. Поўная прыватызацыя прамысловасці — 33,3%.
2. Увядзенне прыватнай уласнасці на зямлю — 60,3%.
3. Хуткае ўвядзенне свабоднага цэнаўтварэння — 37,8%.
4. Звярнуцца да Захаду за фінансавай і тэхналагічнай дапамогай — 17,1%.
5. Тэрмінова арганізаваць распродаж уласнасці заходнім бізнесменам — 7,2%.
6. Увядзенне жорсткай сістэмы дзяржзаказу — 11,7%.
7. Узмацненне дысцыпліны ўзаемных паставак — 51,3%.
8. Павышэнне працоўнай дысцыпліны на месцах — 58,5%.

11. У якой форме Беларусь магла б увайсці ў склад Саюза Суверэнных Дзяржаў?

1. Стаць членам федэрацыі — 22,5%.
2. Стаць членам канфедэрацыі — 41,4%.
3. Стаць асацыіраваным членам ССД — 9%.
4. Падпісаць толькі эканамічнае пагадненне — 34,2%.
5. Рэспубліка не павінна ўваходзіць у склад ССД, а ў эканоміцы поўнасцю арыентавацца на Захад — 3,6%.
6. Цяжка адказаць — 0,9%.

12. Якую дэпутацкую групу ў Вярхоўным Савеце Вы прадстаўляеце?

Да розных дэпутацкіх груп аднеслі сябе 77 чалавек са 111.
Да членаў Дэмклуба — 18 чалавек.
Цэнтр — 7 чалавек.
За дэмакратычныя рэформы — 12 чалавек.
Апазіцыя БНФ — 12 чалавек.
Незалежныя — 23 чалавекі.
Аграрнікі — 1 чалавек.
Прамыславікі — 2 чалавекі.
Беларуская арганізацыя ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл — 1 чалавек.
Рэспубліканская партыя — 1 чалавек.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Хроника

Венгрия—Белоруссия: связи будут прочными

16—18 сентября в Минске пребывала делегация Венгерской республики с целью проведения переговоров о торгово-экономическом и научно-техническом сотрудничестве между БССР и Венгерской республикой.

Венгерскую делегацию возглавлял Чрезвычайный и Полномочный посол ВР в СССР Шандор Дъерке.

В рамках визита проведены презентация и открытие выставки фирмы «Вальтхам-Видимпекс-Конвертрейд». Состоялись рабочие консультации по подготовке проекта Соглашения о торгово-экономических связях и научно-техническом сотрудничестве.

Венгерскую делегацию принял первый заместитель Председателя Совета Министров БССР Михаил Владимирович Мясникович. В ходе разговора обсуждены насущные проблемы сотрудничества, достигнута договоренность о сроках подписания договора.

В конце дня 17 октября состоялся футбольный матч между командами «Динамо» (Минск) и «Видеотон-Вальтхам ФК».

Виктор БЕЛОУСОВ.

Факт

Матриархат отступит?

В Минюсте РСФСР зарегистрирована независимая правоохранительная ассоциация «Отцы и дети».

Ее организаторы высказывают оригинальный взгляд на воспитание детей в семье. «Только отец способен воспитать ребенка полноценным человеком», — утверждают руководители ассоциации. В доказательство своих взглядов они приводят многочисленные примеры положительного влияния на детей семейных традиций в патриархальной России, а рецидивы правонарушений среди подростков объясняют тем, что 70 процентов их случается с детьми, которые воспитываются матерями-одиночками. Ассоциация готовит проекты законодательных актов, которые должны будут признать права отца на воспитание ребенка независимо от претензий матери.

Для осуществления своих идей ассоциация уже открыла отделения в Брянске, Смоленске, Санкт-Петербурге и других городах России, где работу ведут опытные юристы и педагоги.

Леонид ФАДЕЕВ.

Взгляд изнутри

ПТИЦЫ И ГНЕЗДА,

или О кадровой политике Александра АЛЬБАХА

Вы знаете кукушку? Птицу, не строящую своего гнезда, не вскармливающую своих птенцов? Она нужна, эта птица, в природе, где все целесообразно. А в обществе? Судя по всему, у нас развелось слишком много «кукушек». Они разорили все наши гнезда, большие и малые, и птицы-трудяги уже не в состоянии выкормить, обеспечить эту разросшуюся стаю паразитов.

Вот типичная история типичной организации, каких сотни, тысячи.

В 1985 году тогдашний зав. сельхозотделом обкома КПБ Григорий Потачиц привел в специальное конструкторское бюро «Сельхозаммиак» (ныне специальное конструкторское проектно-технологическое бюро научно-исследовательского и проектно-технологического института жидких удобрений — СКПТБ НИКПТИЖ) своего «птенца». Директором в построенное предшественником Николаем Кибом «гнездо» был назначен Александр Альбах.

Как выяснилось, вопросы производства, тем более разработки и внедрения новшеств его не шибко интересовали. Нужно было решить большое количество личных проблем.

Но вот незадача: коллектив уже есть, должности все заняты. Куда «своих» людей пристроить?

Первую «ячейку» Альбах освободил очень быстро: поговорил по «душам» с инженером-строителем — и тот написал заявление по собственному желанию. Единомышленник Альбаха Алексей Кушнеров, принятый на эту должность, а затем возведенный в ранг заместителя директора по общим (!) вопросам, внес достойный вклад в дело дальнейшей реорганизации кадров. Он каждого работника испытывал, что называется, на зуб: чем живет, дышит, свой или «чужой»? Словом, за пятилетку работы Альбаха в должности директора СКПТБ почти все опытные, знающие работники вынуждены были уйти. Оставшиеся либо записывались в угодники, либо так глубоко запрятали свое «я», что до него вряд ли можно теперь докопаться. Сменилось пять инспекторов по кадрам, уволился весь конструкторский отдел, заведующий экспериментальным отделом, заведующий исследовательским сектором и т. д. Только за один прошлый год заявления написали двадцать восемь человек. Это практически четверть всех работающих.

Вся энергия директора и его новоявленного зама была направлена на избавление от неугодных. «А что тут такого,— оправдывал линию директора зам, — каждый руководитель, вступив в должность, приводит свою команду». Но хорошо, если бы эта «команда» еще и работать могла!

...Очередной претендент на увольнение становился в коллективе вроде прокаженного. К нему не всякий подходил, разговаривали озираясь. Но такая позиция никого не спасла. И вот уже следующий «кандидат» подписывает обходной лист. Уходили, казалось бы, по разным причинам: по сокращению, личным обстоятельствам. Но глубинная причина одна: неугоден.

В выборе средств ставленник обкома не стеснялся. Да так разошелся, что не заметил, как выбросил из гнезда всех «птенцов». Не нужен оказался специальному конструкторскому проектно-технологическому бюро конструкторский отдел, не нужны филиалу исследовательского института исследовательский сектор и лаборатория. И даже я, главный инженер, стал не нужен на производстве.

Конечно, я пытался бороться за свои права. Судом был восстановлен на работе. Но в первый же рабочий день после вынужденного прогула услышал от директора: «Я найду способ, как тебя убрать!»

Не прошло и двух недель, как снова оказался за воротами СКПТБ. А почему? Да потому, что тылы у директора организованы по всем правилам «застойного», а может, уже и «перестроечного» периода. Поддержка там, опора здесь. Есть в окружении директора специалисты — не по вопросам технологии, а по части доставания дефицитов... Нет, конечно, Альбах вспоминает и о производстве, и о невыполненных разработках. В сердцах поругивает зав. технологическим отделом Ивана Болдачева.

На таком вот фоне директору легко было получить новую квартиру, автомобиль (вместо передовика производства), построить с привлечением техники СКПТБ два гаража. А еще получить премии за ввод недостроенных домов и за активное участие в работах, связанных с ликвидацией последствий чернобыльской катастрофы.

Но опять-таки встает вопрос: а как же производство? Откровенно говоря, вся работа организации за небольшим исключением свелась лишь к приготовлению суспензий и их внесению. Исследовательские и опытно-конструкторские работы давно на задворках, в чем, конечно, отчасти повинен и я. Стало просто некому их выполнять, благодаря «мудрой» кадровой политике. Вообще вся структура под громким названием специальное конструкторское проектно-технологическое бюро научно-исследовательского института фактически выполняет сейчас функции районного подразделения сельхозхимии. Ни разработки перспектив, ни экономического анализа. Одни корректировки планов для структурных подразделений, чтобы те их выполнили. А зачем напрягаться? Ведь колхозы и совхозы с лихвой оплачивают содержание этого, теперь уже «кукушкиного гнезда»!

Вот и думаешь, а сколько же таких «гнезд» у нас в стране, коль экономика пошла вразнос?

Трофим КАЦЕВИЧ.

г. Гомель.

Пункт гледжання

Каб не пахаваць дэмакратыю

Лічу, што сёння нельга чакаць па звычцы ўказанняў зверху, а неадкладна пачаць стварэнне ў раёнах арганізацыі «Рух за дэмакратычныя рэформы». Падзеі паказалі, што ў час контррэвалюцыйнага перавароту (на маю думку, гэта не путч, а контррэвалюцыя) мы цішком затаіліся, і гэта недаравальна.

Ні адна ўлада не зможа не толькі задавальняць патрэбы простага чалавека, але нават ведаць іх, калі не будуць існаваць грамадска-палітычныя структуры, у якія ўваходзяць прадстаўнікі розных груп насельніцтва. Такой структурай мог бы стаць «Рух за дэмакратычныя рэформы». Наш народ даволі нацярпеўся ад вынікаў партыйнай манаполіі.

Няма сумнення, што ў бліжэйшы час у нашым раёне будуць створаны суполкі сялянскай, сацыял-дэмакратычнай партыі, БСДГ і іншых. У «Рух за дэмакратычныя рэформы» змогуць уваходзіць цалкам партыйныя, прафсаюзныя арганізацыі і асобныя грамадзяне, застаючыся членамі сваёй партыі.

Упэўнены, многія маю прапанову сустрэнуць у штыкі. Каму гэта патрэбна? Маўляў, так званыя дэмакраты пачынаюць прымазвацца да ўлады, каб атрымліваць шалёныя грошы. Зазначу, што новыя грамадскія арганізацыі не будуць збіраць узносы і мець вызваленых работнікаў. Але яны вельмі патрэбны. Справа ў тым, што ў глыбінцы, у тым ліку і ў Капылі, пакуль што нічога не змянілася. Я зрабіў такую выснову, калі ўбачыў неверагодныя перашкоды для правядзення сесіі гарсавета 26 жніўня. І гэта не чыясьці віна, а агульная наша бяда — закамлексаванасць рабскай свядомасці, неразуменне сённяшніх падзей.

Тое, што адбылося, — не проста перамога над путчыстамі, як многія лічаць, а сапраўдная народна-дэмакратычная рэвалюцыя. Праўда, яна толькі-толькі пачынаецца. І можна з упэўненасцю сказаць, што рэакцыйныя сілы неаднойчы паспрабуюць узяць рэванш, асабліва ў той момант, калі рэзка пагоршыцца матэрыяльнае становішча народа. Сёння гэтыя сілы імкнуцца нагнятаць нервовасць, распаўсюджваюць плёткі, быццам хтосьці пагражае партыйным кіраўнікам арыштамі, рыхтуе расправу над радавымі камуністамі. Хіба ж гэта не яўная правакацыя? У нашым раёне няма вінаватых у контррэвалюцыйным перавароце.

І яшчэ. Давайце падумаем і скажам сумленна, чаму ж у сельскагаспадарчым раёне да гэтага часу няма суполкі сялянскай партыі? Між іншым, яе кіраўніцтва ўжо 19 жніўня актыўна выступіла супраць хунты. Хіба ў нас няма ў сялян уласных інтарэсаў, за якія змогуць пастаяць толькі яны самі?

Давайце падумаем яшчэ, чаму ж і нашы газеты без усялякіх пярэчанняў надрукавалі ўсе распараджэнні самазванцаў? І тое, што сёння мясцовыя газеты перасталі падпарадкоўвацца райкаму, яшчэ ні аб чым не гаворыць. Новыя гаспадары могуць стаць такімі ж цэнзарамі, як і ранейшыя. Газеты павінны быць сапраўды свабоднымі, дэмакратычнымі і плюралістычнымі.

Барыс БАГДАНОВІЧ,
старшыня Капыльскага гарсавета.

Нам стало известно

Танцы на воде

Похоже, что забот насчет хорошего отдыха у юных пинчан теперь поубавится.

На Припяти снова после двухгодичного перерыва в выходные дни по вечерам открылись дискотеки на теплоходе «Витебск». Три часа увлекательного турне по реке с музыкой и танцами, аттракционами придутся по вкусу местной молодежи и гостям города.

Иван ГОНЧАРОВ.

Пинск.

Актуально

КПБ—КПСС: НАЧАТА ОПИСЬ ИМУЩЕСТВА

Как известно, до окончательного решения судьбы КПБ—КПСС контроль за использованием партийного имущества возложен на Комитет по управлению госимуществом при Совете Министров БССР. Заместитель председателя комитета И. А. ЛЯХ возглавляет созданную в этих целях общественную комиссию, в которую входят также представители Национального банка БССР, Министерства финансов, народные депутаты БССР В. Н. Заблоцкий, В. В. Новик, Е. В. Новиков.

— Иван Алексеевич, у вас есть представление о масштабах партийного имущества, которое вы должны контролировать?

— Мы не имеем пока реестра этой собственности, не знаем ее общей балансовой стоимости. Ни один государственный орган не располагает этой информацией. К финансовым делам партии, например, никогда не подпускались государственные ревизоры. Сейчас по распоряжению Совмина создаются инвентаризационные комиссии, которые к 25 сентября должны завершить опись имущества КПБ—КПСС.

— Пока суть да дело, не начнет ли таять это имущество на глазах?

— Собственно говоря, наши функции и заключаются в том, чтобы исключить передачу или продажу партийной собственности в другие руки. Любая такая сделка, если она проходит через банк и мы о ней таким образом узнаем, будет аннулирована.

— И что, были уже случаи, которые требовали вашего вмешательства?

— Пока только один. В первый же день после известных постановлений парламента Минский сельский райком продал Минскому же райисполкому автомобиль «Волга» за 5 тысяч рублей. Мы, конечно, приостановили эту срочную распродажу.

— В собственности КПБ были не только партийные особняки, но и предприятия, пансионаты. Значителен финансовый вклад компартии в некоторые коммерческие структуры. Относится ли к ним постановление о «приостановлении деятельности»?

— Начнем с особняков. В служебные помещения партийных комитетов допускаются сегодня только те работники, которые обеспечивают техническое обслуживание зданий, выплату зарплаты и текущую хозяйственную деятельность. Беспрепятственно должны пропускаться и лица, арендующие помещения в этих зданиях.

Предприятия, находящиеся в непосредственном ведении Управления делами ЦК КПБ, в общем-то не останавливались ни на один день. В обычном режиме работают цековская столовая, гостиница «Октябрьская», автобаза. Прибыль, кстати, они по-прежнему перечисляют на партийный счет. Другое дело, что снять с этого счета какую-то сумму без нашего ведома уже невозможно. До перерегистрации производственных и коммерческих структур с финансовым участием КПБ—КПСС их хозяйственная деятельность осуществляется под строгим контролем местных Советов и банковских учреждений.

— Кстати, эта аббревиатура КПБ—КПСС не означает ли, что на какую-то долю имущества белорусской компартии может претендовать московский ЦК или те, кто станет его наследником?

— Если следовать духу последних решений парламента и правительства, все партийное имущество, находящееся на территории Белоруссии, является собственностью республики.

— Насколько я знаю, Госимуществу БССР поручено представить в Совмин «предложения о порядке передачи собственности КПБ—КПСС и ЛКСМБ в собственность Белорусской ССР». Серьезная задача. Значит ли это, что все, кто положил глаз на партийную собственность, могут обращаться к вам?

— Не стоит спешить с дележом, будем помнить, что правовую оценку деятельности КПБ—КПСС даст Прокуратура Белорусской ССР. Тем самым определится и дальнейшая судьба компартии. Но при любом развитии событий, мне кажется, вряд ли партия сохранит свою собственность в полном объеме. Чем-то придется поделиться с народом.

Вел беседу
Игорь ФИЛИПЕНКО.

Журналісцкае расследаванне

ДЫК ШТО, І СМУРОД ВЫТРЫМАЕМ?

У нашай газеце за 17 верасня быў надрукаваны ліст жыхара вёскі Сіняло Мінскага раёна Віктара Сакалоўскага «Жить или сматывать удочки?..» У ім аўтар з трывогай пісаў аб складаным становішчы, у якім апынуліся вяскоўцы, што жывуць каля ачышчальных збудаванняў горада Мінска.

Наш карэспандэнт вырашыў дэталёва разабрацца ў сітуацыі і тэрмінова выехаў да аб'екта з рамантычнай назвай «Глеевыя сажалкі»...

БЕЗ усялякага сумнення, нямногія жыхары шматмільённага Мінска сур'ёзна задумваліся над пытаннямі: куды падзяваецца ўсё тое, што мы штодзённа змываем ва ўнітазы, ці можа дзейнасць велізарнага горада перашкаджаць каму-небудзь жыць? Ды гэта і не дзіўна. Дзесяцігоддзямі нас прывучалі сядзець у сваім шкарлупінні, праяўляць ініцыятыву толькі тады, калі гэта патрэбна было кіраўніцтву. Так мы выходзілі на мітынгі і патрабавалі міру ва ўсім свеце або свабоды Нельсану Мандэле. Маўчалі або не давалі гаварыць і тым, хто непасрэдна сутыкаўся з нашымі чыста сацыялістычнымі цяжкасцямі.

Але час мяняецца. Людзі пачынаюць патрабаваць да сябе чалавечых адносін. Вось і гэтае пісьмо, надрукаванае 17 верасня, — адно з такіх, у якіх сапраўдны крык болю...

Вёска Сіняло. Мы толькі што праехалі паўз спартыўны комплекс «Стайкі», пераскочылі праз Свіслач, спыняемся каля кар'ераў. Спыняемся і, нягледзячы на тое, што імжыць дождж, адчуваем смурод. Чорная смярдзючая твань «раз'ехалася» ў двух кар'ерах. Крыху далей, ужо за калючым дротам з надпісамі «Праход забаронены», пачынаюцца і стацыянарныя адстойнікі. То ўзлятаюць, то садзяцца завэзганыя кулікі. Яны, як і людзі, ужо прывыклі да ўсяго, магчыма, успрымаюць гэта непаразуменне як сваё роднае возера.

Вырашаем спачатку пагаварыць з рабочымі, якія будаваюць новы магільнік.

Экскаватаршчык Рыгор Віктаравіч **Шайтораў:**

— Мы людзі чорныя. Нам паставілі, там і капаем. А астатняе нас не датычыць...

Бульдазерыст Уладзімір Рыгоравіч **Аляшкевіч:**

— Вада ў вёсцы дрэнная, бо каналізацыйныя сцёкі прарвалі плаціну і выліліся ў непадрыхтаваныя кар'еры. Гэта адбылося па віне эксплуатацыйнікаў. І, вядома, усё смуроддзе зараз прасочваецца праз пясок, як праз сіта, ідзе па грунтовых водах...

Цесляры-бетоншчыкі Міхаіл Іванавіч **Рыхлёнак** і Шакір Муртуз-аглы **Мегеррамаў:**

— Паглядзіце, мы ўсё робім, як запланавана. Зараз займаемся магільнікам. На дно, на бакі кладзём лямец, на яго — плёнку, яшчэ два слаі лямцу, зноў плёнку. Потым усё гэта паліваецца бітумнай мастыкай, а зверху насыпаецца дваццаць сантыметраў пяску. Праз такую сценку нішто не можа прасачыцца. А калі вылілася ў просты кар'ер, то, вядома, усё наваколле будзе запаскуджана.

Начальнік аб'яднання арэндных прадпрыемстваў «Мінскводбуд» Зігмунд Балеслававіч **Русовіч:**

— Аб'ект «Глеевыя сажалкі» сапраўды ўзводзіць наша ПМК-42. Але ж усё робіцца па праекту. Калі б што-небудзь здарылася па нашай віне, то заказчык — «Мінскводаканал» — даўно б прад'явіў прэтэнзіі. А так я ад вас першага чую пра незадаволенасць сінелаўчан, пра пахі, пра дрэнную ваду...

Начальнік упраўлення «Мінскачыствод», якое ўваходзіць у аб'яднанне «Мінскводаканал» і непасрэдна займаецца эксплуатацыяй «Глеевых сажалак», Валерый Міхайлавіч **Якавенка:**

— Вада ў вёсцы Сіняло дрэнная не з-за нашых ачышчальных збудаванняў, а з-за ўгнаенняў, ядахімікатаў, ды і свінаферма ад іх недалёка. Таму ў вёску праведзены водаправод. А што датычыць нашых аб'ектаў, дык будаўніцтва іх узгаднялася і з мясцовымі органамі, і з органамі аховы прыроды. Так што мы тут ні пры чым.

Я больш скажу: раней такія сажалкі наогул будаваліся без усялякага ахоўнага экрана. Выбіраўся грунт і туды адходы зліваліся. Але нават і гэтыя першыя кар'еры бясшкодныя, там адбыўся натуральны працэс, нічога ў грунтовыя воды ўжо не праходзіць. Вакол «Глеевых сажалак» прабурана 22 свідравіны, і аналіз вады паказвае, што яна нармальная.

— Валерый Міхайлавіч, пагадзіцеся: не надта прыемна людзям жыць з такім пахам...

— А што рабіць? Горад жыве, у некаторых мікрараёнах пах яшчэ горшы, людзі таксама мучаюцца. Але ж не з'язджаюць нікуды. Мы не маем такіх дакументаў, што пах з'яўляецца экалагічным бедствам, і таму ніякіх падстаў, каб людзям выплачваць кампенсацыю, няма. А без такіх глеевых сажалак не абыходзяцца ні адны ачышчальныя збудаванні ні ў адным савецкім або замежным горадзе. Адходы можна было б выкарыстоўваць у якасці ўгнаенняў, але вытворчасць у Мінску вялікая, у сажалках асядае шмат цяжкіх металаў. Таму запоўненыя даверху магільнікі засыпаем зямлёй і будзем садзіць лес.

Дарэчы, мікрараён Шабаны знаходзіцца ў значна горшых умовах, чым вёска Сіняло. Там і прамысловыя прадпрыемствы, і звалка, і станцыі аэрацыі. Наогул, проста дзіўна, што сярод усяго гэтага пачалі жылыя дамы будаваць... А калі гаварыць наконт нашых збудаванняў, дык вакол іх, акрамя вёскі Сіняло, ёсць і дачныя пасёлкі. Мы папярэджвалі дачнікаў, што аб'ект можа расшырацца, могуць быць нязручнасці... Дык што вы думаеце, сотні пісем атрымалі ў адказ. І ва ўсіх: нічога, мы пацерпім. Канешне, да горада блізка, зручна людзям мець тут дачу...

Вось такое меркаванне ў кіраўніка ўпраўлення, які займаецца эксплуатацыяй «Глеевых сажалак». А што ж думаюць самі сінельчане?

Станіслаў Вікенцьевіч **Жарко:**

— А я ўжо прывык! Сёння вецер у наш бок не дзьме, дык наогул нармальна. Канешне, ваду піць нам забаранілі, шкодная яна. А бульбу, гароднiну сваю ядзім. Дзе ж нам іншую ўзяць?

Уладзімір Іванавіч **Хмялеўскі:**

— А я што? Жыву, як усе...

Юзэфа Іосіфаўна **Верабей:**

— Ды куды нам ехаць? Хто нам дзе пабудуе? А пра кампенсацыю для нас з Мінводгаса за шкоднасць ніхто і не думае гаварыць. Добра, што яшчэ сілай нас не выселілі, пакінулі ў спакоі...

Мы яшчэ раз праязджалі каля смярдзючых сажалак, і мяне не пакідала думка: Божа, што ж мы за людзі? Калі мы нарэшце навучымся хоць свае ўласныя інтарэсы адстойваць? Ніхто не прызывае пратэставаць, спыняць работу, мітынгаваць. Але калі нарэшце ўцямім, што мы — людзі. Што любая арганізацыя, а тым больш дзяржава, павінны ставіцца да нас як да людзей. Чаму тыя ж амерыканцы, філіпінцы, індыйцы згаджаюцца на будаўніцтва побач з іх жыллём шкодных вытворчасцей толькі тады, калі вырашаецца пытанне кампенсацыі ім за пагаршэнне жыццёвых умоў? Чаму такое пытанне ніколі не ўзнікала ў нашай былой «самай чалавечнай» дзяржаве?

Сёння краіна мяняецца. Сёння з'яўляюцца новыя дзяржавы і, магчыма, праз пяць-дзесяць год і мы будзем жыць, можа, у суверэннай Беларусі, можа, у нейкім новым Саюзе. Але я вымушаны канстатаваць адно: пакуль мы будзем будаваць «Глеевыя сажалкі» і не думаць пра вяскоўцаў, узводзіць новыя аб'екты, ігнаруючы думку мясцовых жыхароў, нічога ў нашым жыцці не зменіцца. Назаві нашу краіну хоць самай вольнай, самай суверэннай, але нічога гэта не дасць, пакуль чалавек не будзе гаспадаром той зямлі, якая яму належыць, пакуль інтарэсы канкрэтнага чалавека будуць нішто ў параўнанні з так званымі дзяржаўнымі...

Не згодны? Пажывіце каля «Глеевых сажалак» і адчуйце сябе Грамадзянінам...

Сяргей ПЛЫТКЕВІЧ.

НА ЗДЫМКАХ: будуецца новы магільнік; у ваколіцах вёскі Сіняло...

Фота АЎТАРА.

В ДВУХ СЛОВАХ

ТАСС • «ИНФО-НОВА» • «НАРОДНАЯ ГАЗЕТА»

ПРИБАЛТИКА ИНТЕГРИРУЕТСЯ...

23—24 сентября в Таллине состоится встреча премьер-министров балтийских государств с представителями крупнейших финансовых организаций мира. В ней примут участие президенты и вице-президенты Всемирного банка, Международного валютного фонда (МВФ), Инвестиционного банка северных стран, Европейского банка реконструкции и развития (ЕБРР). Как сообщил генеральный директор внешнеэкономического департамента Эстонии Мехис Пильв, на совещании будет обсуждаться вопрос о возможном вхождении республики во Всемирный банк, МВФ и ЕБРР.

ДЕТЕЙ — НЕ БРОСИМ!

Как сообщила газета «Слово Кыргызстана», в республике в самое ближайшее время появится приют для 200 детей-сирот. Все расходы по его сооружению и оборудованию возьмет на себя Всемирный исламский фонд содействия (со штаб-квартирой в Саудовской Аравии).

ВОЗВРАЩЕНИЕ ХРАМА

Православной русской общине Еревана передана церковь Покрова Божьей Матери, построенная в начале века казаками, полк которых размещался на окраине города в Канакере. В годы советской власти в этом здании располагались клуб, столовая и конюшня. До последнего времени здесь действовал районный Дом культуры.

Настоятель церкви отец Макарий, получивший недавно благословение от патриарха Всея Руси Алексия Второго, сообщил, что теперь церковь будет действовать под юрисдикцией Московской патриархии. Он также призвал российских верующих поддержать немногочисленную общину Еревана материально.

ВОДЫ РИЖСКОГО ЗАЛИВА СТАНУТ ЧИЩЕ

Здесь введена в действие первая очередь городских очистных сооружений мощностью 100 тысяч кубических метров в сутки. К августу 1992 года она достигнет 350 тысяч кубических метров, а к 1994 году будет завершено строительство всего каскада сооружений на 700 тысяч кубических метров в сутки. Это существенно улучшит экологическое состояние Рижского залива, в воды которого сбрасываются городские отходы.

НЕ ДО ВИНОГРАДАРСТВА

На очередной сессии Верховного Совета Дагестана принято решение о преобразовании съезда народных депутатов ДССР в Верховный Совет республики. То есть в Дагестане вернулись к прежней организации законодательной власти — теперь все 226 народных депутатов республики стали членами Верховного Совета. На сессии обсуждалось положение в Казбековском районе Дагестана, где из-за противостояния аварцев и чеченцев-аккинцев несколько дней назад было введено чрезвычайное положение.

У БИЗНЕСМЕНОВ СВОЕ АГЕНТСТВО

Конгресс российских деловых кругов провел в Москве консультативную встречу с представителями постпредств суверенных государств. На ней обсуждался вопрос об учреждении информационного агентства межгосударственного экономического сообщества (ИАМЭС).

ДА ЗДРАВСТВУЕТ ДЕРЕВЯННЫЙ РУБЛЬ!

Девальвация рубля растет с каждым днем. Но на радость тех, кто имеет валюту, и на горесть, кто хочет купить, литовский банк скупает и продает валюту по новым ценам.

Доллар США скупается за сорок рублей, продается за 42 рубля 80 копеек; марка ФРГ — 23,30 и 24,94; английский фунт стерлингов—68,70 и 73,51; голландский гульден — 20,70 и 22,15; французский франк — 6,90 и 7,30; финская марка — 9,60 и 10,28. Также поднялся и курс валюты других стран. А вот в эстонском банке курс валюты намного меньше. Допустим, доллар в США скупается за 29,96 и продается за 32,06; марка ФРГ — 17,49 и 18,89. Как подсчитали латышские экономисты, к концу года американский доллар к рублю будет сопоставлен 1:80.

ПОКА «ТИТАНИК» ЕЩЕ НЕ ПОШЕЛ КО ДНУ...

«Каждый может наносить себе ущерб, как ему вздумается! — сказал известный экономист Геннадий Лисичкин, комментируя намерения отдельных республик бывшего СССР ввести собственную валюту.— Свою валюту можно создавать лишь тогда, когда эта большая страна уже развалится—«Титаник» пойдет ко дну. Тогда, конечно, хватай шлюпку, бревно и спасайся, кто как может. Но если исходить из того, что «Титаник» не тонет, а держится на плаву, эти вещи его как раз и погубят».

Народная газета

ЗАРУБЕЖЬЕ

⊙ ТАСС ⊙ ИАН ⊙ «Инфо-нова» ⊙ «Народная газета» ⊙

«22 декабря мы начнем ликвидацию иммигрантов» —

такая угроза прозвучала в тихой бельгийской провинции Лимбург

«У нас никогда ничего не происходит», — любят утверждать жители бельгийской провинции Лимбург, славящейся своими молочными продуктами и прекрасными пейзажами. И им веришь, когда едешь по дорогам провинции. Маленькие городки кажутся погруженными в дрему. Их обитатели живут в соответствии с раз и навсегда установленными порядками: работа, семья, по вечерам — стаканчик любимого пива в местном кафе, по воскресеньям — обязательный визит в церковь. Поражает и дружелюбие местных жителей. Поэтому, видимо, не случайно там еще с довоенных времен оседали приезжающие на заработки иностранцы. Вначале это были итальянцы, испанцы, в 50-х годах начали появляться выходцы из мусульманских стран. До последнего времени провинция не ведала никаких проблем, связанных с пребыванием иммигрантов, тем более, что последние чаще всего устраивались на тяжелую малооплачиваемую работу, не привлекающую бельгийцев.

Но вот в начале июля этого года прозвучал тревожный звонок. «С 22 декабря мы начнем ликвидацию иммигрантов, от двух до пяти человек еженедельно» — таков был смысл послания, подписанного некоей организацией «антиисламских коммандос» и направленного бургомистрам нескольких лимбургских городов, а также имаму мечети, расположенной в г. Хесден-Зольдер, где проживает много турецких рабочих.

В послании содержится требование о высылке из страны не только мусульман, но и лиц других национальностей, не являющихся западноевропейцами, с одновременной конфискацией их имущества. Если власти, говорится в послании, ничего не предпримут в этом направлении до 16.00 22 декабря 1991 года (чем не час X?), 425 «хорошо подготовленных» боевиков организации начнут физическое уничтожение иммигрантов.

Трудно сказать, насколько серьезна эта угроза, но власти обеспокоены. Содержание послания стало известно местным жителям и вызвало у них естественную озабоченность по поводу собственной безопасности. Ведь если в провинции начнутся убийства иммигрантов, где гарантия, что те не ответят на насилие насилием?

Кто мог распространить подобное послание? В стране появляется все больше организаций «правого» толка. И создаются они не на пустом месте. Например, есть в Бельгии такая «правая» партия, как «Власм блок» («Фламандский блок»), активно действующая в провинциях Фландрии Ее деятели давно требуют от правительства «очистить страну от иностранцев». И влияние этой партии медленно, но неуклонно растет. Об этом говорят хотя бы результаты июльских коммунальных выборов в Брюсселе, на которых «Власм блок» сумел завоевать более 3 процентов голосов, хотя два года назад имел лишь 2,7 процента. Немного, скажете вы, но надо иметь в виду, что эта партия никогда ранее не пользовалась популярностью в бельгийской столице. Однако рост безработицы, наплыв иммигрантов, в том числе и из Восточной Европы (из Польши, кстати, налажено регулярное движение автобусов), вызывает страх у обывателя перед будущим, и этим умело пользуются правые и националисты.

В общем, Бельгия все больше становится тем местом, где иностранную рабочую силу, пусть даже готовую выполнять самую грязную работу, явно не ждут с распростертыми объятиями. В стране и своих безработных уже около 350 тысяч, а для 10-миллионной Бельгии это немало.

Местные власти понимают, к чему может привести массовый наплыв иммигрантов в страну: усиление социальной напряженности, рост преступности, возрастание националистических тенденций среди фламандцев и валлонов (франкоязычной части населения). А уж последнее им совсем ни к чему, если учесть, с какими трудностями идет процесс строительства федерального государства. Поэтому еще в марте этого года в Брюсселе состоялась межминистерская конференция под председательством главы бельгийского правительства Вильфрида Мартенса, которая рассмотрела вопросы иммиграции и утвердила ряд мер, направленных на борьбу с иностранцами, нелегально оседающими в стране и пытающимися устроиться на работу в нарушение существующего законодательства. Добавлю, что действующее ныне законодательство в области трудоустройства практически не дает возможности иностранцу устроиться на работу легальным путем, если он не политический беженец и не является ближайшим родственником бельгийского подданного.

Так что собирающемуся в Бельгию на валютные заработки следует хорошо подумать, прежде чем начинать паковать чемоданы.

Борис ЛАБУСОВ.

Брюссель.

Помощь — да, но кому?

